Нужно признать, что выразительный интерьер есть понятие равнозначное эмоциональному интерьеру, то есть интерьеру, выражающему переживания и мысли архитектора, а грамотная композиция и есть средством достижения выразительного интерьера. Материальная предметность архитектурной среды обеспечивает течение деятельного процесса (среда действия) и одновременно создает эмоционально-эстетический эквивалент процесса как отражение его духовной сути и социальной значимости (среда восприятия) [2].

**Заключение.** Музеи – некоронованные короли среди общественных зданий, однако история влияет и на монархов. Еще в 19 веке сформировался образ музея – храма, хранящего высокое искусство, а поход в музей был наполнен некой торжественностью и требовал от человека определенной культуры и саморегуляции.

Но музейная архитектура 20 века (и тем более – 21) настойчиво борется со сложившимся стереотипом. На протяжении последних 10–15 лет наблюдается настоящий «бум» музейного строительства, в которое вкладываются огромные деньги. Музейные проекты привлекают внимание архитекторов по всему миру, давая им возможность выразить свою индивидуальность и воплотить самые смелые фантазии. Архитектор в данном случае выступает как творец. В современных зданиях музеев чувствуется бунт против обыденности и повседневности, стремление к неземному, инопланетному [3].

Список литературы

1. Шимко, В.Т. Архитектурно-дизайнерское проектирование, Основы теории. / В.Т. Шимко. – Москва, «Архитектура-С»,2006
2. Столяренко Л.Д., Самыгин С.И., Багадирова С.К. – Психология: 100 зкзаменационных ответов – М.,ИКД «МарТ», 2005.
3. http://www.jurnal.org/articles/2009/iskus11.html

## ГРАФІЦІ ЯК СРОДАК АРГАНІЗАЦЫІ ГАРАДСКОЙ ПРАСТОРЫ І ЯК ГЕНЕРАТАР НОВЫХ РУХАЎ У МАСТАЦТВЕ І ДЫЗАЙНЕ

*М.Л. Цыбульскі*
*Віцебск, УА "ВДУ імя П.М. Машэрава"*

Графіці самы моцны рух у мастацтве апошняга часу, своеасаблівая разнавіднасць альтэрнатыўнага мастацтва і адна з самых актуальных форм мастацкага самавыяўлення ва ўсім свеце. Сёння графіці гэта ўжо не проста від гарадскога вулічнага мастацтва але ў нейкай ступені манументальная каліграфія,. якая хутка развіваецца. Ж.Бодрийар лічыць, што графіці па значэнні працілегла ўсім відам мас-медыя і рэкламным знакам. Графіці спрыяюць асвойванню ўрбаністычнай прасторы. Татуяванне сцен ператварае іх у жывую сацыяльную тканіну горада [1].

Мэта дадзенага артыкула абазначыць месца і ролю графіці ў арганізацыі і эстэтызацыі мастацкай прасторы, у генерыраванні новых рухаў у мастацтве і дызайне.

**Матэрыял і метады**. Графіці стала стартавай пляцоўкай для многіх мастакоў і дызайнераў. Шматлікія графітчыкі зрабілі кар'еру у вядомых кампаніях ў дызайне скейтбордаў, адзежы і абуткуі г.д. У той жа час шматлікія райтэры, ператварыліся ў мастакоў, якія супрацоўнічаюць з афіцыйнымі галерэямі, пры чым часцяком выкарыстоўваючы ў сваёй творчасці не толькі аэразольную фарбу, свой першасны інструментарый, але і іншыя матэрыялы [2].

Репозиторий ВГУ

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Графіці, здаецца, канчаткова сцвердзіла сябе ў поп-культуры, райтэры звярнуліся да ілюстравання і дызайну, працягваючы адначасова практыкаваць стрыт-арт. У выніку графітысты распрацоўваць дызайн, лагатыпы, ілюстрацыі, абутак і адзежу для вядомых кампаній Nike, Adidas, Lamborghini, Coca Cola, Stussy, Sony, Nasdaq і іншых. Кульмінацыяй такіх узаемадачыненняяў, дзе графіці змешваецца з відэагульнямі і хіп-хопам, стала выйсце тэлесерыяла, вядомага ва ўсім свеце пад назвай Kung Faux, стваральнікам якога быў Мік Нойман.

Пытанне аб тым, ці з'яўляецца графіці формай мастацтва горача абмяркоўваецца з 1980-х гадоў. Мастацтвазнаўцы шэрагу краін лічаць што некаторыя графіці валодаюць дастатковай мастацкай каштоўнасцю і вызначаюць графіці як форму выяўленчага мастацтва. Іншыя перакананы: графіці – гэта сапраўдны арт-тэрарызм. Нехта лічыць графіці гарадскім фальклорным вандалізмам. Спрэчкі, пра тое, якое месца графіці займае ў сучаснай візуальнай культуры не сціхаюць і сёння, падаграваючы рознагалоссі паміж ахоўнікамі парадку і графітыстамі.

Агульнавядома, што ў большасці краін свету нанясенне графіці на чыю-небудзь ўласнасць без дазволу на тое ўладальніка дадзенай уласнасці лічыцца вандалізмам і караецца па законе. У іншых краінах графіці разглядаецца законам як малаважнае правапарушэнне. І тым не менш, аўтары графіці, як правіла, хаваюць свае імёны за псеўданімамі.

Сёння ў тэрміна графіці існуе вялікая колькасць значэнняў. Але сутнасць большасці зводзіцца да шэрагу асноватворных прынцыпаў якія вызначаюць сам характар графіці, якім называюць малюнкі, ці надпісы, прадрапаныя, напісаныя ці намаляваныя фарбай, ці чарнілами на сценах і іншых паверхнях. Ступень складанасці і ступень майстэрства могуць быць самымі разнастайнымі. Да графіці можна аднесці любы від вулічнага размалёўвання сцен, на якіх можна знайсці ўсё: ад простых напісаных слоў да вытанчаных малюнкаў

Існуе мноства розных стыляў і відаў графіці. У шматлікіх краінах і гарадах ёсць свае вядомыя райтеры, якія ствараюць на вуліцах горада сапраўдныя шэдэўры. Пры гэтым размова ідзе зусім не пра так званыя тэгі, ("tag") – самую распаўсюджаную форму райтынга, не пра радыкальныя і палітычныя графіці і, безумоўна, не пра "бомбінг". Разважаючы аб ролі графіці ў эстэтызацыі гарадскога асяроддзя мы маем на ўвазе так званыя. "pieces" і "masterpieces" – больш складаныя кампазіцыі, як па колькасці колераў, так і ступені стылізацыі. Іх стварэнне патрабуе большага часу і большай адказнасці ад іх аўтараў.

Сучаснае графіці часцяком уключае элементы іншых мастацтваў і выкарыстоўвае новыя тэхналогіі. Да прыкладу, "Graffiti Research Lab" ("Лабараторыя па даследаванню графіці") натхніла райтэраў на выкарыстанне ў працах праецыруемых малюнкаў і магнітных святлодыёдаў. Італьянскі мастак Kaso займаеццааднаўляючым графіці, эксперыментуючы з абстрактнымі формамі і старанна прадуманымі трансфармацыямі ранейшых прац у тэхніцы графіці.

Сучаснае мастацтва "street-art" ў новым тысячагоддзі разам з усёй графіці-індустрыяй выйшлі на якасна іншы ўзровень, што шмат у чым злучана са з'яўленнем на рынку прафесійнага абсталявання ад вядучых сусветных вытворцаў. Стыль і тэхніка графіці ўвесь час развіваюцца і ўдасканальваюцца. Кожная краіна ўносіла і ўносіць нешта новае ў гэта мастацтва. У Германіі, Даніі, Нарвегіі і шэрагу іншых краін існуюць цэнтры, дзе графітысты выконваюць працу па замовах, пачынаючы ад распісвання будынкаў, аўтатранспарту і канчаючы афармленнем памяшканняў устаноў, якія займаюцца арганізацыяй дасуга. Але



Репозиторий ВГУ

супраць камерцыялізацыі выступаюць шматлікія "старыя" мастакі, якія лічаць, што графіці, нарадзіўшыся як “crime art”- супрацьзаконнае мастацтва - не мае права ўступаць з законам у дзелавыя адносіны. Разам з тым шматлікія новыя каманды мастакоў графіці не лічацца з ідэалогіяй і цалкам пераходзяць на заказныя працы.

Графіці, прадстаўляючы творы субкультуры, з’яўляючыся элементам стыхійнага мастацкага афармлення гарадскога асяроддзя, жэстам самадзейнай творчай стыхіі, сёння, па-сутнасці, трансфармуюцца у манументальную форму сучаснага мастацтва. Графіці перастае быць усяго толькі мовай камунікацыі моладзевых супольнасцяў і вычварнай формай альтэрнатыўнага мастацтва ХХ стагоддзя. Малюнкі, якія з'яўляюцца на тэхнічных збудаваннях, сценах дамоў, на платах, працяглых сценах гарадскіх аўтастаянак на ўнутраных баках агародж перагонаў, выйсцях з тунэляў метрапалітэна і г.д. з аднаго боку візуальна “разбураюць” эстэтычную тканіну горада, а с другога утвараюць ў часта сумным і бязколерным асяроддзі выразны каларыстычныя дамінанты. Графіці набывае статус сур'ёзнага мастацтва, якое здольна надаць непаўторны выгляд дагэтуль не-самавітым аб'ектам.

Сёння графіці імкнецца да легалізавання і камерцыялізацыі. У камерцыйныя праекты першымі паспрабавалі ператварыць графіці галерысты. Паступова найболей цікавыя працы прадстаўнікоў street-art'a перавандравалі з гарадскіх сцен у галерэі Манхэтэна і на старонкі адмысловых выданняў. Вядомыя брэнды адзежы часта запрашаюць графіці-мастакоў для стварэння рэкламы адзежы вулічнага стылю. З'явіліся спецыялізаваныя графіці-крамы і камерцыйныя школы графіці, адкрыты спецыялізаваныя сайты, праводзяцца фэсты. Апроч прыватных галерэй, працы вулічных мастакоў сёння можна ўбачыць у Брытанскім музеі, Нью-ёркскім музеі сучаснага мастацтва, музеі Метрапалітэн, Бруклінскім музеі, Музей сучаснага мастацтва ў Чыкага, у фондах Трэццякоўскай галерэі на Крымскім Вале.

**Заключэнне.** Відавочна, што графіці адыгрывае пэўную ролю ў арганізацыі мастацкай прасторы горада, у з’яўленні і развіцці новых рухаў у мастацтве і дызайне. Пры тым паміж класічнымі графіці і, яе сучаснымі формамі безумоўна ёсць "дыстанцыя". не толькі часавая, але і стылістычная. Адна з прычын – змянілася тэхніка і тэхналогія графіці. Разумна, на наш погляд паступілі тыя еўрапейскія ўлады якія адчуўшы, што змагацца з "творцамі" графіці безсэнсоўна, пайшлі насустрач тым, хто разумее графіці як спосаб самавыяўлення, мае задаткі добрага густу, а таксама сябруе з правапарадкам. Безумоўна, падобныя варыянты графіці больш стрыманыя і "акультураныя", і ў выніку больш прафесійныя. Не выпадкова сёння графітысты" маюць сваё таварыства; рэгулярна праводзяць спаборніцтвы на лепшы малюнак і арыгінальнасць аўтарскай задумы.

Спіс літаратуры


1. Baudrillard J. Symbolic Exchange and Death. L., 1993.
2. Ganz, Nicolas. «Graffiti World». New York. Abrams. 2004


Репозиторий ВГУ